Офіс за Дэмакратычную Беларусь

# Навіны для Беларусі

Нумар XIII

21 красавіка 2008 года

*Office for a Democratic Belarus*

## *У нумары*

*Беларускае пытанне ў Радзе Еўропы* 1-2

*Даклад Хрыстаса Пургурыдэса па злоўжываннях крымінальным заканадаўствам* 2

*Інфармацыйны вечар па Беларусі ў г. Генце* 3

*Зварот Андрэа Рыгоні да беларускага парламента* 3

*Слуханні па Чарнобылі ў ЕП* 4

*Мастацтва беларускага плаката* 4-7

*Абмеркаванне візавай палітыкі ў дачыненні Беларусі ў Еўрапарламенце* 7

Мы ў сеціве

www.democraticbelarus.eu

# Беларускае пытанне ў Радзе Еўропы

Тэма Беларусі на мінулым тыдні ў Страсбуры падчас сесіі Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы ўздымалася амаль кожны дзень. Не абышла ўвагай нашу краіну і **Ангела Меркель**, бундэс-канцлер Германіі, адказваючы на пытанне галандскага парламентара наконт таго, як будаваць адносіны з Беларуссю і як дапамагаць рэпрэсаваным у краіне. Спадарыня Меркель выказалася ў падтрымку дэмакратычнай апазіцыі і ўсіх палітзняволеных. Ад імя Хрысціянска-дэмакратычнага саюзу, партыі, да якой яна сама належыць, кіраўнік дзяржавы звярнулася да міжнароднай супольнасці з заклікам надаваць больш пільную ўвагу сітуацыі ў Беларусі і рабіць усё магчымае, каб тыя, хто знаходзіцца за кратамі па палітычных матывах, не адчувалі сябе забытымі, а ведалі, што маюць міжнародную падтрымку.



На тэму палітзняволеных выказаўся таксама Вярхоўны камісар па правах чалавека, **Томас Хамарберг** (Швецыя). На яго думку, трэба спрабаваць будаваць адносіны з Беларуссю з надзеяй, што ў будучыні сітуацыя палепшыцца, і краіна далучыцца да Рады Еўропы. Камісар выказаў занепакоенасць дрэннымі ўмовамі ўтрымання людзей у беларускіх вязніцах і паабяцаў разгледзець прапанову некаторых парламентароў абмеркаваць з афіцыйным Мінскам магчымы візіт Камісіі па папярэджанні катаванняў (Commission on Prevention of Torture) у Беларусь. Па яго словах, офіс камісара мае кантакты з беларускімі праваабаронцамі, але дагэтуль яшчэ не дастаткова было зроблена, каб дапамагчы палепшыць сітуацыю з правамі чалавека ў краіне.



Дакладчык Камітэта па юрыдычных пытаннях і правах чалавека **Хрыстас Пургурыдэс** (Кіпр), які добра вядомы сваім дакладам па зніклых асобах, а таксама сваёй даволі жорсткай пазіцыяй у дачыненні да дыялогу паміж Еўропай і беларускім кіраўніцтвам, на гэты раз падрыхтаваў аналіз сітуацыі са злоўжываннямі крымінальным заканадаўствам у Беларусі. Справаздача знайшла



падтрымку большасці прадстаўнікоў Асамблеі, якія ўхвалілі рэзалюцыю і рэкамендацыі, прапанаваныя дакладчыкам.

У часе канферэнцыі міжнародных недзяржаўных арганізацый прадстаўнікі грамадзянскага сектару Беларусі мелі магчымасць распавесці пра выпадкі рэпрэсій супраць актывістаў арганізацый і змены ў заканадаўстве, што рэгулюе дзейнасць НДА. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі шляхі падтрымкі міжнароднай супольнасцю праваабаронцаў і грамадскіх дзеячаў у Беларусі. Сярод канкрэтных прапаноў — арганізацыя мерапрыемства разам з падкамітэтам ПАРЕ па медыях пад назвай “Канферэнцыя па дэмакратызацыі масмедыяў у Беларусі”. Для удзелу ў дыскусіях плануецца запрасіць прадстаўнікоў беларускай і міжнароднай грамадзянскай супольнасці, праваабарончых арганізацый, медыя-асацыяцый, а таксама афіцыйных асоб з Міністэрства інфармацыі, Міністэрства замежных

## Беларускае пытанне ў Радзе Еўропы

спраў і Нацыянальнага сходу Беларусі. Ідэя правядзення такой канферэнцыі была падтрымана парламентарамі Асамблеі і беларускай дэлегацыяй на пасяджэнні падкамітэта па медыях. У дадатак кіраўнік Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ)

**Жанна Літвіна** таксама прапанавала стварыць пастаянны камітэт дзеля маніторынгу сітуацыі з медыямі ў Беларусі. Па яе словах, такі камітэт павінен уключаць сяброў незалежных інфармацыйных выданняў і медыйных згуртаванняў, міжнародных экспертаў і прадстаўнікоў уладных структур Беларусі, адказных за распрацоўку і выкананне законаў, датычных СМІ.

*Фота з афіцыйнага сайта ПАРЕ*

21/04/2008

**Падрыхтавана “Офісам за дэмакратычную Беларусь”**

## Хрыстас Пургурыдэс прадставіў справаздачу па выпадках злоўжывання крымінальным заканадаўствам у Беларусі




Падчас прэзентацыі даклада па злоўжываннях крымінальным заканадаўствам у Беларусі Хрыстас Пургурыдэс (Кіпр), дакладчык камітэта па юрыдычных пытаннях і правах чалавека ў Парламенцскай Асамблеі Рады Еўропы, распавёў наступную анекдатычную гісторыю.

Ідзе судовае пасяджэнне па справе аб забойстве маладым чалавекам абаіх сваіх бацькоў. На пытанне суддзі, што ён можа сказаць у сваё апраўданне, хлапец адказаў: “Памілуйце мяне, я – сірата”.

Менавіта такім чынам, на думку спадара Пургурыдэса, можна сёння ахарактарызаваць спробы беларускага ўрада наладзіць дыялог з Еўропай. Большасць дэпутатаў Асамблеі з ім пагадзіліся.

Падчас сваёй прамовы дакладчык падкрэсліў, што сітуацыя ў Беларусі не палепшылася. Рэформы заканадаўства, на яго думку, пайшлі ў зваротным накірунку, і іх вынікі накіраваныя на далейшую дыскрэдытацыю апанентаў улады праз крыміналізацыю дзейнасці апазіцыйных структур, вынясенне прысудаў палітычным актывістам па эканамічных артыкулах і выкарыстанне іншых падобных прыёмаў. Нягледзячы на вызваленне некаторых палітзняволеных—што Пургурыдэс шчыра павітаў—рэпрэсіі працягваюцца, Аляксандр Казулін застаецца за кратамі, смяротнае пакаранне не адменена, мірныя дэманстрацыі, як і раней, заканчваюцца брутальным разгонам сіламі АМАПу.

Сярод прапаноў, агучаных Пургурыдэсам напрыканцы прэзентацыі справаздачы, наступныя:

- пільна сачыць за разгортваннем падзей і аказваць дапамогу ахвярам палітычных рэпрэсій;
- пашырыць магчымасці навучання для студэнтаў, якія адлічваюцца з беларускіх навучальных устаноў па палітычных матывах;
- весці спіс тых, хто адказны за выданне і выкананне рэпрэсіўных загадаў.

На думку дакладчыка, прыняты некалькі год таму спіс на забарону ўезду ў Еўразвяз некаторым беларускім чыноўнікам з’яўляецца эфектыўным механізмам уздзеяння на беларускае кіраўніцтва.

Большасць прысутных у зале дэпутатаў ухвалілі даклад кіпрскага парламентара, палічыўшы яго збалансаваным і заснаваным на правераных фактах. Яны пагадзіліся, што ў Беларусі не выконваецца нават мінімум канстытуцыйных норм. Калі беларускі ўрад жадае паўнавартаснага дыялогу з Еўропай, на думку парламентароў, ён павінен зрабіць сур’ёзныя крокі насустрач дэмакратызацыі, а не самаізаляваца. А пакуль такога жадання з боку афіцыйнага Мінску няма, трэба шчыльна супрацоўнічаць з грамадзянскай супольнасцю, прапаноўвалі выступоўцы. Таксама важна панізіць кошт Шэнгенскіх віз для грамадзян краіны і палегчыць працэдуру іх атрымання.

Беларусь ёсць неад’емнай часткай Еўропы, падкрэслівалі ўсе удзельнікі дэбатаў (акрамя прадстаўнікоў Расійскай Федэрацыі). Дзверы для дэмакратычнай Беларусі застаюцца адчыненымі ў Радзе Еўропы і яе з нецярпеннем чакаюць у сваіх шэрагах.

COUNCIL OF EUROPE CONSEIL DE L’EUROPE

17/04/2008

*Фота з афіцыйнага сайта ПАРЕ*

**Падрыхтавана “Офісам за дэмакратычную Беларусь”**

# Інфармацыйная вечарына па Беларусі ў Генце



9 красавіка  прадстаўнікі “Офіса за дэмакратычную Беларусь” паўдзельнічалі ў інфармацыйнай вечарыне ў г. Генце (Бельгія), прачытаўшы лекцыю для студэнтаў эканамічнага факультэта мясцовага універсітэта . Чытанні па Беларусі былі арганізаваныя нідэрландскай грамадскай арганізацыяй Пакт Крысці.

Кіраўніца ОДБ Вольга Стужынская прапанавала кароткую гістарычную даведку пра краіну і ахарактарызавала сучасную сітуацыю ў Беларусі. Бельгійскіх студэнтаў цікавілі найперш палітычная і эканамічная сітуацыя ў краіне, а таксама інвестыцыйны клімат і развіццё супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўразвязам.

Пасля лекцыі наведвальнікам іпрэзы была прадэманстравана



дакументальня стужка Юрыя Хашчавацкага “Плошча”.

09/04/2008

**Падрыхтавана “Офісам за дэмакратычную Беларусь”**

# Зварот Дакладчыка ПАРЕ Андрэа Рыгоні да старшынь абедзвюх палат беларускага Парламента



«Я заклікаю вас стаць першапраходцамі на шляху ўвядзення мараторыю на смяротнае пакаранне ў Беларусі як прамежкавага кроку ў кірунку поўнага яго адмены», — гаворыцца ў адкрытым лісце дакладчыка Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЕ) Андрэа Рыгоні на імя старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзіма Папова і старшыні Савета Рэспублікі Генадзя Навіцкага, паведамляе прэсавая служба ПАРЕ.

А.Рыгоні падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у Еўропе, дзе дагэтуль захоўваецца пакаранне смерцю.

«Кожнае пакаранне смерцю — гэта ўжо само па сабе занадта шмат, — гаворыцца ў лісце. — Якім жудасным ні было б учыненае злачынства, якімі бясспрэчнымі ні былі б доказы віны, нішто не можа апраўдаць забойства чалавека дзяржавай».

Дэпутат адзначыў, што ганарыцца тым фактам, што ў італьянскай вобласці Таскана, адкуль ён родам, пакаранне смерцю было адменена яшчэ ў 1786 годзе.

«Гэтае рашэнне тлумачыцца тым, што вышэйшая мера пакарання амаральная, яна не прадугледжвае магчымасці перавыхавання правапарушальніка ў грамадстве, не ўтрымлівае людзей ад учынення такіх злачынстваў. Акрамя таго, прывядзенне ў выкананне такога прысуду  незваротнае і не падлягае выпраўленню ў выпадку судовай памылкі», — падкрэсліў **А. Рыгоні.**

Ён зазначыў таксама, што на рэферэндуме 1996 года грамадзяне Рэспублікі Беларусь выказаліся за захаванне вышэйшай меры пакарання. Аднак, падкрэслівае А. Рыгоні, у 2004 годзе Канстытуцыйны суд краіны правёў працу па ацэнцы адпаведнасці Канстытуцыі палажэнняў аб пакаранні смерцю, якія ёсць у Крымінальным кодэксе.

«Суд прыйшоў да высновы, што шэраг палажэнняў Крымінальнага кодэксу не адпавядаюць Канстытуцыі, і прапанаваў або адмяніць пакаранне смерцю, або ўвесці мараторый на яго выкананне», — нагадаў А. Рыгоні.

«Народным павінна быць у аснове сваёй любое рашэнне, але існуюць пэўныя пытанні, па якіх кіраўніцтву краіны трэба ўзяць на сябе адказнасць першапраходцаў, якія вядуць за сабой людзей і паказваюць ім шлях, — падкрэсліваецца ў лісце. — Пакаранне смерцю з'яўляецца апошняй формай адмаўлення правоў чалавека, якая парушае нормы і каштоўнасці Рады Еўропы. Я прашу вас і Нацыянальны сход Беларусі ўзяць на сябе палітычнае абавязацельства, якое гарантуе, што ніхто больш не будзе пакараны смерцю ў Беларусі».

15/04/2008

*Фота з афіцыйнага сайта ПАРЕ*

**Поводле БелаПАН,  nn.by**

# Слуханні па Чарнобылі ў Еўрапейскім Парламенце



*На здымку дэпуты ЕП Яцэк Пратасевіч, Лайма Андрыкене, Віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага Парламента Алеха Відал-Квадрас Рока*

17 красавіка Еўрапейская народная партыя—Еўрапейскія дэмакраты (EPP-ED) у Еўрапарламенце з ініцыятывы літоўскай дэпутаткі Лаймы Андрыкенэ арганізавала слуханні “ЧАРНОБЫЛЬ СЁННЯ”, прысвечаныя сітуацыі ў Беларусі.

Падчас дзвюх пленарных сесій перад аўдыторыяй выступілі даследчык у галіне ўдзеяння малых доз радыяцыі на арганізм чалавека, былы палітвязень прафесар Юры Бандажэўскі; прафесар, сябра Акадэміі Навук Беларусі Іван Нікітчанка; дацэнт, доктар-педыятар Галіна Бандажэўская; ліквідатар, старшыня аб’яднання “Саюз. Чарнобыль-Беларусь” Аляксандр Ваўчанін; адвакат Гары Паганяйла; першы намеснік старшыні партыі БНФ Вінцук Вячорка і іншыя.

У прывітальным слове да пачатку канферэнцыі Віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага Парламента **Алеха Відал-Квадрас Рока** адзначыў, што ліквідатары, змагаючыся з наступствамі катастрофы, ратавалі не толькі сябе і сваю краіну, але і ўсю Еўропу, таму праблемам гэтай катэгорыі грамадзян павінна надавацца вельмі пільная ўвага не толькі ў Беларусі, але і на міжнародным узроўні.

Старшыня дэлегацыі па адносінах з Беларуссю ў Еўрапарламенце Яцэк Пратасевіч нагадаў, што факт выбуху на ЧАЭС напачатку хаваўся савецкімі ўладамі, і што сам ён даведаўся пра катастрофу праз радыё “Вольная Еўропа”, падкрэсліўшы такім чынам важнасць наяўнасці незалежных СМІ.

Былы кіраўнік Літоўскай Рэспублікі, дэпутат Еўрапарламента Вітаўтас Ланбергіс пачаў сваю прамову з прапановы ўшанаваць памяць ліквідатараў і ахвяр Чарнобылю хвілінай маўчання. У сваім выступе ён падкрэсліў, што Беларусь—гэта частка Еўропы, а Чарнобыль—агульнаеўрапейскага праблема, яшчэ і таму, что ад радыяцыі пацярпелі краіны, якія ўваходзяць у склад Еўразвязу.

Выступоўцы з беларускага боку прыводзілі сумную статыстыку павелічэння колькасці захворванняў, абумоўленных пагаршэннем экалагічнай сітуацыі ў Беларусі, распавядалі пра сітуацыю з ліквідатарамі і пацярпелымі ад аварыі на ЧАЭС у Беларусі на фоне адмены ільгот.

Сярод прапаноў, што прагучалі ў часе слухання, адмена візавага рэжыму для ліквідатараў наступстваў катастрофы, стварэнне міжнароднай арганізацыі па падтрымцы такіх асоб і цэнтра па вывучэнні праблем уздзеяння радыяцыі на навакольнае асяроддзе дзеля прадухілення магчымых трагедый.

Асабліва падкрэслівалася неабходнасць забеспячэння насельніцтва забруджаных тэрыторый чыстымі прадуктамі харчавання.

Французскі адвакат Эмануэль Людо адзначыў, што і ў яго краіне людзі таксама пакутуюць ад хвароб, выкліканых уздзеяннем радыяцыі, таму праблема Чарнобыля і выкарыстання атамнай энергіі і звязанай з гэтым рызыкай з’яўляюцца універсальнымі.

Напрыканцы пасяджэння была прынята рэзалюцыя, якая сярод іншага заклікае ерапейскую супольнасць працягваць эканамічную падтрымку па сацыяльнай экалагічнай рэабілітацыі рэгіёнаў, што пацярпелі ад Чарнобыля, забяпечваючы адначасовы кантроль за мэтазгодным карыстаннем сродкаў.

18/04/2008

***Фотарэпартаж са слуханняў можна паглядзець на нашым сайце ў раздзеле “Фотагалерэя”***

**Падрыхтавана “Офісам за дэмакратычную Беларусь”**

# Мастацтва беларускага плаката




*У. Цэслер і С. Войчанка, 2001 г.*

Беларусь – малавядомая краіна ў Заходняй Еўропе і свеце, адна з апошніх, якая “адважылася” стаць незалежнай ад Савецкага Саюза. Незалежнасць шмат для каго здавалася неверагоднай і нават непажаданай. Беларуская савецкая наменклатура імкнулася як мага шчыльней ва ўсім набліжацца да саюзнага цэнтру. Бракавала самастойнасці. Гэта стварыла сітуацыю нястачы ўласнай ідэнтычнасці, што праяўляецца і сёння.

Інтэнсіўныя пошукі ўласнай ідэнтычнасці пачаліся з часоў “Перабудовы” і працягваюцца і сёння. Непазбежным для гэтага перыяду ў кожнай нацыі з’яўляецца пэўная міфалагізацыя гістарычнай спадчыны. Мы пачалі прымяраць на сябе зусім іншую ідэнтычнасць папярэдніх эпох, неіснуючых на сённяшні дзень грамадскіх колаў, класаў, антуражаў. Безумоўна, гэта ўсё частка нашай гістарычнай спадчыны, нашае Атлантыды, але ці толькі на *рэтра* глебе ўзыходзяць парасткі сучаснага?

# Мастацтва беларускага плаката (працяг)

Плакат у Беларусі выдаваўся нават за нямецкай акупацыяй. Нічога выключнага тут не было. Прапагандзе ў Савецкім Саюзе адводзілася вялікая роля, і беларускі плакат, пачынаючы з 30-х гадоў XX стагоддзя, калі Цэнтральны камітэт партыі ў Маскве ўсур’ёз і надоўга ўзяўся за ўпарадкаванне спраў у плакатнай літаратуры, заставаўся ўсяго толькі адгалоскам палітыкі цэнтру. Плакат гэтага часу адпавядаў не толькі зместам але і стылістыкай стандартным савецкім узорам візуальнай прапаганды. Рэй тут вёў спачатку сацыялістычны рэалізм, пазней маскоўская група мастакоў Кукрыніксы.

Магчымасць аслабаніцца з’явілася ў сярэдзіне 1980-х, калі на мастацкую сцэну прыйшла група нон-канфармістаў, большасць з якіх скончыла новую на той час, створаную ў 1977 годзе кафедру прамысловай графікі, якая пазней была ператворана ў факультэт дызайну Беларускай Акадэміі мастацтваў. Прафесійнае станаўленне як спецыялістаў, калі заходняе слова “дызайн” было незнаёмым і маласпаўсюджаным, а бытавыя стандарты савецкага жыцця былі да болю знаёмыя, не магло адбывацца без абвяшчэння сваёй грамадзянскай пазіцыі. Так джынсы станавіліся для гэтага кола людзей не запаветнай марай, а штодзённай вопраткай, якую да таго яны маглі самастойна вырабіць саматужным метадам ва ўмовах сацыялістычнай эканомікі. Яшчэ за дваццаць год да пачатку джынсавай рэвалюцыі ў якасці дыпломнай працы Дзмітры Сурскі абараніў дзейны праект гарадскога



*Дзмітры Сурскі, 1982г.*



*А.і В. Даманавы, 1989*

аўтамабіля, які дызайнам нагадваў стылістыку джынсаў. На гэтым аўтамабілі аўтар раз’язджаў па горадзе і моцна выбіваўся з шэрагу аўто савецкай індустрыі. Праца гэтая атрымала тады розгалас не толькі ў Беларусі і Саюзе, але і была надрукавана на старонках італьянскага выдання па дызайне “Domus”. У 2001 годзе рэкламны плакат джынсаў Levis, прымеркаваны да трыццацігоддзя фестывалю ў Вудстоку аўтарства Цэслера і Войчанкі, на якім беларускі пейзаж плаўна трансфармуецца ў джынсы, быў уключаны ў збор твораў мастацтва прэстыжнейшага Луўра.

Плакат станавіўся актыўным жанрам, вылучаўся сваёй дэмакратычнай накіравансцю. Па-новаму адлюстроўвалася сацыяльная, гістарычная тэматыка, праблема таталітарнай ментальнасці грамадства. Не заўсёды творы знаходзілі шлях да гледача. Мастакі шукалі прызнання за межамі Беларусі, уключаліся да ўдзелу ў шматлікіх міжнародных конкурсах плаката. Геаграфія беларускага візуальнага мастацтва значна пашырылася дзякуючы гэтаму. Міжнародныя конкурсы плаката ў Варшаве, Брно (Чэхія), Лахці (Фінляндыя), Таяме (Японія), Мехіка, Каларада, дзе беларускія аўтары не толькі праходзілі конкурсны адбор, але і атрымлівалі ўзнагароды, з’яўляюцца гэтаму доказам. Своеасаблівым прарывам з’явіўся 1986 год, калі на Міжнародным біенале плаката ў Варшаве група плакатыстаў з Беларусі (Цэслер, Войчанка, Шалюта) атрымала Гран-пры конкурсу (прэмію Генеральнага сакратара ААН) і адзін спецыяльны прыз. На трыенале плаката ў Таяме ў 1991 годзе са 195 савецкіх плакатаў конкурсны адбор прайшлі толькі 16, дзевяць з якіх былі беларускімі! Міжнародныя конкурсы плаката таго часу ўяўлялі своеасаблівыя форумы актуальных праблем чалавецтва, экалагічных, палітычных, сацыяльных, калі выпрацоўвалася свая мова метафар, сімвалаў, зразумелая без “перакладу”. Плакат пераадольваў культурныя і моўныя бар’еры. Гартаючы старонкі каталогаў конкурсаў, прыходзіш да высновы, што праз трапнае выкарыстанне візуальных метафар гэты дыялог мастакоў і графічных дызайнераў уздымаўся да ступені глабальнага дыялогу.

Дзякуючы намаганням нашых мастакоў Беларусь рабілася арганічнай часткай гэтага дыскурсу.

Спецыфіка ўдзелу савецкіх мастакоў




*У. Цэслер С. Войчанка, 1995*

у міжнародных конкурсах складалася ў тым, што працы адпраўляліся цэнтралізавана праз адмысловую камісію пры саюзе мастакоў у Маскве. Такім чынам, конкурсныя працы на міжнародны конкурс падвяргаліся яшчэ і ўнутранай цэнзуры. Зразумела, што пад увагу магло брацца не толькі тое, наколькі плакаты адпавядалі таму вобразу краіны, які імкнуўся навязаць пра сябе Савецкі Саюз, але і персанальныя кантакты, сувязі мастакоў. Калі пагартаць каталогі конкурсаў, у якасці зваротнай сувязі для мастакоў з СССР пазначаны быў адзін і той жа адрас – Цэнтральнага Дому Мастака ў Маскве. Калі група беларускіх мастакоў адважылася самастойна, амаль кантрабандным спосабам адпраўляць працы на конкурс, эфекту не прыйшлося доўга чакаць. Варшаўскі біенале плакату 1986 году прынёс групе мастакоў (У.Цэслер, С.Войчанка,

А.Шалюта) гран-пры конкурсу і адмысловы прыз, ў 1988 таксама спецыяльны прыз, а ў 1989 годзе іх плакат пад назвай “Аўган” атрымаў бронзавы медаль міжнароднага біенале плакату ў Лахці. А яшчэ праз некалькі гадоў жалезнай заслоны не стала, і ўмацоўваць міжнародныя кантакты стала больш проста.

Працуючы ў жанры, мастакі развівалі дызайнерскую канцэпцыю, чым значна ўзбагацілі магчымасці беларускага візуальнага мастацтва. Плакаты набываюць новую прасторавасць, да іх ствараюцца складаныя інсталяцыі, набывае папулярнасць пастановачны плакат. Назіраюцца новыя эксперыменты з графікай. На прыкладзе мастацтва плаката адбываецца станаўленне новай візуальнай рэчаіснасці. Графічныя цытаты Кітаевай, Саркісава да спадчыны УНОВИСа, савецкага канструктывізму вяртаюць зацікаўленасць да гэтых прагрэсіўных з’яў у гісторыі мастацтва.

Выпрацоўваецца адметная візуальная мова беларускага плаката. Назіраецца гэта перш за ўсё ў вынаходніцтве ўласнай знакавасці, якая асацыятыўна прыводзіць да раскрыцця тэмы. У плакаце У. Крукоўскага “Назаўсёды ў памяці народа” памяць падзеяў вайны ўвасабляецца ў полымі свечкі, якое гарыць з снараду, а ў плакаце Р. Найдзена “Чарнобыль” татальнасць тэхнагеннай катастрофы падкрэсліваецца тым, што свечка Чарнобыля – свінцовая, У.Цэслер у плакаце, прымеркаваным да ХХ-годдзя катастрофы ўпісвае знак радыяактыўнасці ў арнамент традыцыйных беларускіх ручнікоў, прыгадваючы, што наступствы катастрофы могуць праяўляцца праз пакаленні. На плакаце антыбюракратычнай тэматыкі “Справа№” (Д. Сурскі, Т. Гардашнікава) павуцінне складзена з канцэлярскіх сашчэпак , а гнілы восеньскі ліст у форме двухгаловага арла сімвалізуе крах царскай Расіі ў плакаце С. Войчанкі “Кастрычнік” . Не раз рэчы зусім трывіяльныя асэнсоўваюцца аўтарамі пад іншым вуглом гледжання, нечаканым сэнсавым і візуальным ракурсам. Так да плаката “Хлеб – усяму



*Дз. Сурскі, Т. Гардашнікава, 1985 г.*

галава” ствараецца інсталяцыя, на якой на каравай хлеба накінуты саламяны капялюш . У гэтым прачытваюцца сілуэты галавы чалавека. А ў плакаце У. Цэслера і С. Войчанкі, прымеркаваным да 50-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у ваенную фуражку ўкінуты дзяржаўныя медалі і ўзнагароды як міласціна . Аляксандр і Вольга Даманавы ў плакаце, прымеркаваным да гадавіны пачатку другой сусветнай вайны выказваюць свой скептыцызм што да справы ўсталявання і барацьбы за мір у вобразе голуба, скрыжаванага са слімаком, хада якога, нягледзячы на імпэт шырока раскінутых крылаў вельмі марудная. Праз аўтарскую інтэрпрэтацыю шмат якіх трывала замацаваўшыхся візуальных клішэ прапануецца альтэрнатыўны погляд. Успрыманне такіх візуальных пасланняў адбываецца далёка па-за кантэкстам іх уласцівай тэматыкі, набывае філасофскае гучанне. Канцэптуальнасць такіх рашэнняў уражвае гледача. Мастак К. Вашчанка да міжнароднага конкурсу, прымеркаванага да 40-ой гадавіны вызвалення Асвенцыма зрабіў плакат, на якім сілуэт чалавека на аркушы люстраны і наведвальнік можа ўбачыць сябе – свой уласны адбітак, прыбліжаючы рэха гэтай чалавечай трагедыі як мага бліжэй да індывідуальнага ўспрымання. Публікацыя плаката і водгук да яго ангельскага мастацтвазнаўцы з’явіўся на старонках польскага часопісу “Projekt” у 1985 годзе. Гэты ж



*Ул.Крукоўскі,1976*

часопіс надрукаваў спецыяльным укладышам ужо ўзгаданы вышэй плакат У. Цэслера, С.Войчанкі, А. Шалюта “1986 – год міру”. Плакат “Кадры вырашаюць усё” з’явіўся на вокладцы часопіса “Огонёк” ў 1990 годзе, калі часопіс друкаваўся больш чым 5-мільённым накладам .

Феномен беларускага мастацтва плаката 80-90 х сфарміраваўся дзякуючы існаванню асяроддзя прафесіяналаў, якія плённа працавалі ў жанры, канкурыравалі паміж сабой, імкнуліся такім чынам умацаваць сваю грамадзянскую пазіцыю і данесці яе да людзей. Не апошнюю ролю адыгралі і іншыя фактары, як існаванне сучаснай тэхналагічнай базы, створанай выдавецтвам “Беларусь”, так і запатрабаванасць сацыяльнага плакату ў дзяржаве, наогул. Плакаты даволі смелага, дэмакратычнага зместу выходзілі і ў дзяржаўных выдавецтвах. Гэтае пакаленне у некаторым сэнсе ўскладала на сябе місіянерскія функцыі пракладання дарогі новай прафесіі, якая магла змяніць грамадства, наблізіць краіну да больш сучасных, заходніх узораў ладу жыцця, як падавалася. Для гэтых мараў існавалі і даволі аб’ектыўныя прычыны, улічваючы тое, што на схіле свайго існавання Савецкі Саюз укладаў даволі значныя інвестыцыі ў дызайн, па ўсёй краіне была створана сетка Інстытутаў дызайну (ВНИИТЭ). Але мары хутка былі развеяны, калі адбыўся крах гаспадарча-палітычнай сістэмы, а спецыфіка развіцця незалежнай краіны не давала і дагэтуль не спрыяе ўключэнню рынкавых механізмаў, якія маглі б даць новы імпульс развіццю дызайну. Нягледзячы на гэта, шмат хто з гэтага асяроддзя і дагэтуль запатрабаваны, працуе ў памежных сферах дызайну і мастацтва. Дызайнеры А. Кітаева і А. Шалюта непасрэдным чынам прычыніліся да стварэння сучаснага дызайну расейскага тэлебачання (тэлеканалы НТВ, Культура).

Гэта, бадай, самае значнае пераўвасабленне і працяг выкладзенай на гэтых старонках культурнай з’явы, якая адбывалася ў беларускім выяўленчым мастацтве

Беларускі плакат 1980-90 х адбыўся як прыкметная мастацкая з’ява свайго часу. Праз мастацтва такога масавага жанру ў дэперсаналізаваным таталітарным грамадстве была зроблена спроба адшукаць сваю ідэнтычнасць. Першы раз у гісторыі беларускае мастацтва так адметна заяўляе пра сабе ў свеце.

21/04/2008

**Ягор Суркі для “Офісу за дэмакратычную Беларусь”**

# Візавая палітыка ў дачыненні да Беларусі абмеркоўвалася ў Еўрапейскім Парламенце




Сёння, у першы дзень чарговай сесіі Еўрапейскага Парламента, якая праходзіць 21-24 красавіка ў Страсбуры, адбыліся дэбаты на тэму атрымання Шэнгенскіх віз грамадзянамі Украіны і Беларусі. Дыскусія праходзіла з удзелам прадстаўніка Еўрапейскай Камісіі. Ад імя гэтай інстытуцыі выступіў Камісар па транспартнай палітыцы, віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі Жак Баро.

Распавядаючы пра сітуацыю вакол Беларусі, Камісар паўтарыў тое, што было агучана і раней: з-за палітычнага клімату ў краіне на гэты момант існуюць вельмі абмежаваныя магчымасці весці перамовы наконт візаў з сённяшнім беларускім урадам. Спадар Баро выказаў надзею на паляпшэнне сітуацыі ў будучыні і у гэтым кантэксце прыгадаў адкрыццё прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі ў Мінску.

Камісар нагадаў парламентарыям, што выключэнні ў правілах атрымання беларусамі Шэнгенскіх віз могуць быць зробленыя ў індывідуальным парадку. Суседнія з Беларуссю дзяржавы таксама могуць ініцыяваць дамовы па перамяшчэнні ў памежнай зоне. Напрыклад, такія перамовы ўжо пачаліся паміж Беларуссю і Польшчай.

Амаль усе выступоўцы, якія прадстаўляюць розныя краіны ЕЗ і розныя палітычныя фракцыі ў Еўрапарламенце, пагадзіліся, што беларускія грамадзяне не павінны пакутаваць двойчы: ад рэпрэсіўнага рэжыму з аднаго боку і ад высокіх коштаў на Шэнгенскія візы-- з іншага. Гэта добра, што існуе магчымасць для некаторых сяброў Еўразвязу ўводзіць спрошчаны рэжым руху на памежных зонах, але візавая палітыка ЕЗ у дачыненні да Беларусі і Украіны павінна быць іншай у цэлым, которая б не ставіла пад сумнеў агульную знешнюю палітыку аб’яднання.

Шараговыя грамадзяне Беларусі, на думку сяброў Еўрапарламента, павінны мець нашмат большыя магчымасці ездзіць у краіны Шэнгенскай дамовы. Гэта паскорыла б працэс дэмакратызацыі ў краіне і стварыла ўмовы для праеўрапейскага накірунку развіцця краіны. Ізаляцыя уладаў Беларусі не павінна ператварыцца ў ізаляцыю ўсяго насельніцтва.

Працэдура афармлення віз, са словаў польскага дэпутата Марэка Сівеца, для жыхароў Беларусі і Украіны сёння ператварылася ў “прыніжальную для чалавечай годнасці” працэдуру. Паўстае пытанне ці гэта часова альбо перманентна??

Еўрапарламентарыі звярнуліся да Камісіі з заклікам разгледзець сітуацыю ізноў і шукаць усе магчымыя шляхі дзеля як мага скарэйшага вырашэння праблемы.




21/04/2008

**Падрыхтавана “Офісам за дэмакратычную Беларусь”**